# АНТЫЯУРЭЙСКІЯ ПАГРОМЫ НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ У 1917-22 г.г.

**Н.В. Мінава**

Пагромы яурэйскага насельніцтва на Гомельшчыне ў перыяд 1917-22 г.г. былі арганізаваны і справакааны рознымі, пераважна антысавецкімі, сіламі, а менавіта: у 1917-19 г.г. ініцыятарамі пагромаў былі прадстаунікі як мясцовага, так і немясцовага паходжання;у жніуні 1919 - ліпені 1920 г. адзначаны пагромы, якія былі арганізаваны польскімі акупацыйнымі войскамі; у лістападзе 1920 – студзені 1921 г. адзначаліся пагромы, якія арганізоувалі узброеныя фармаванні Булак-Балаховіча; у 1921-22 г.г. пагромы, якія былі учынены прадстаунікамі мясцовага насельніцтва, ці, па тэрміналогіі савецкіх органаў, мясцовымі бандамі.

З пагромаў 1917-19 г.г. асабліва вылучаецца пагром, які адбыўся у Гомелі падчас, так званага «Стракапытаўскага» мецяжу 24-28 сакавіка 1919 г. У час пагрому адбываліся грабяжы і збіванні яурэйскага насельніцтва. Было жортка забіта да 25 камуністаў, большасць якіх была яўрэйскай нацыянальнасці. Мяцеж чырвонаармейцаў Тульскай брыгады быў накіраваны супраць бальшавікоў, значную колькасць якіх складалі яурэі, незадаволенне бальшавікамі было распаўсюджана на ўсё яурэйскае насельніцтва.

Ад пагромаў, якія былі арганізаваны польскімі акупацыйнымі войскамі у жніуні 1919-ліпені 1920 г., найбольш пацярпелі Мазырскі і Рэчыцкі паветы. Яўрэйскае насельніцтва вымушана было цярпець грабяжы і здзекі, прыцягвалася на прымусовую працу,адзначаліся забойствы яўрэяў. Агульную колькасць ахвяр польскага тэрору на Гомельшчыне з-за дрэннага захавання крыніц вызначыць складана. Захаваліся дадзеныя па асобным населеным пунктам: у Петрыкаве было забіта 6 яурэяў, Мазыры-2, Калінкавічах-3, акрамя таго у Мазырскім павеце было яшчэ забіта 12 яўрэяў. Матывацыя пагромаў была перад усім палітычнай:яўрэяў абвінавачвалі у камунізме і шпіянажы.

Фармаванні Булак-Балаховіча на Гомельшчыне таксама арганізоувалі пагромы, у час якіх яурэйскае насельніцтва падвяргалася масавым грабяжам, здзекам і забойствам. У вёсках Бібяткі было забіта 19 яурэяў (XI.1920), Міхедавічы-60 (XI.1920), Вялікія Гарадзяцічы-70 (26.XI.1920), Малыя Гарадзяцічы-10 (XI.1920) Мазырскага павета, у Калінкавічах-26 (1920), Хойніках-40 (1920). Усяго, па няпоўных дадзеных, балахоўцамі было забіта больш 246 яурэяў. У дадзеным выпадку палітычныя прычыны пагромаў спалучаліся з жаданнем парабаваць. Пагромы 1921-22 г.г.былі арганізаваны групоўкамі мясцовага насельніцтва, пераважна суправаджаліся забойствамі яурэяў. Так, у Ручаёуцы Рэчыцкага пав. было забіта 40 яурэяу (7.II.1921), Васілевічах-9 (16.IV.1921), Капаткевічах-165 (10.VI.1921). Усяго, па няпоўных дадзеных, было забіта больш 400 яурэяў. Асабліва жорсткімі былі пагромы груповак Галакі (Васільчыкава І.В.), што дзейнічалі тут з лютага па

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ліпень 1921 г. Акрамя гэтых, дзейнічалі групоўкі Савіцкага, братоў Мядзведзявых, Мельнікава.